PolotskSU



УДК 908(476)+712.3

# ДЗЕЙНАСЦЬ УСТАНОЎ АДУКАЦЫІ ПОЛАЦКА Ў КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТУ XX СТСТ. ПА МАТЭРЫЯЛАХ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА АРХІВА БЕЛАРУСІ

*І.П. ВОДНЕВА*
Краязнаўчы музей Полацка, філіял НПГКМЗ

*У артыкуле раскрываецца інфармацыйны патэнцыял пісьмовых крыніц па гісторыі развіцця ўстаноў адукацыі Полаччыны XIX – пачатку XX стст. з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.*

У фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (далей – НГАБ) захоўваецца значная колькасць дакументаў па гісторыі развіцця адукацыі г. Полацка падчас уваходжання горада ў склад Расійскай імперыі. Розныя аспекты дзейнасці ўстаноў адукацыі і сістэмы асветы ў цэлым на тэрыторыі сучаснай Беларусі заўсёды з’яўляліся прадметам даследавання навукоўцаў (М.А. Ступакевіч, С.В. Снапкоўская, Т.Б. Блінова, С.М. Васковіч, А.Ф. Самусік і інш.). Сёння частка матэрыялаў НГАБ па гісторыі адукацыі Полаччыны прадстаўлена асобнымі фондамі, што значна аблягчае іх даследаванне. Так, матэрыялы аб дзейнасці Полацкага кадэцкага корпуса вывучалі В.І. Шайкоў, А.М. Лукашэвіч, С.І. Палякоў, Я.У. Глазырын; Полацкай настаўніцкай семінарыі – Р.І. Аўчыннікава, М.А. Гуляк; Полацкай жаночай і мужчынскай гімназій – А.Ф. Самусік, Г.М. Раманенкава; Полацкага 5-класнага жаночага вучылішча – В.Д. Краско. Але шмат карыснай інфармацыі разрознена і знаходзіцца сярод дакументаў дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, на пошук якіх трэба затраціць шмат часу.

Мэта дадзенай працы – раскрыць інфармацыйны патэнцыял пісьмовых крыніц з фондаў НГАБ, якія могуць вывесці даследаванне гісторыі развіцця ўстаноў адукацыі Полаччыны XIX – пачатку XX стст. на больш высокі ўзровень.

Пасля ўваходжання Полацка ў склад Расійскай імперыі пытаннямі адукацыі стала займацца створанае пра Аляксандры І Міністэрства народнай асветы (далей – МНА). Адной з галоўных задач у першыя гады існавання міністэрства стала стварэнне заканадаўчай базы для рэгулявання адукацыйнай сферы краіны. Нарматыўнымі актамі ў сваёй дзейнасці карысталіся папячыцелі вучэбных акруг, непасрэдна падпарадкаваныя ім саветы на чале з інспектарамі, дырэктары семінарый і інш.

З 1803 г. Полацк увайшоў у склад Віцебскай губерні як павятовы цэнтр, а па пытаннях адукацыі да 1917 г. рабіў справаздачы перад папячыцелем Санкт-Пецярбургскай вучэбнай акругі (з 1829 па 1850 г. – Беларускай вучэбнай акругі). Але акрамя ўстаноў Міністэрства народнай асветы пытаннямі адукацыі займаліся таксама Ваеннае і Духоўнае ведамствы, якім у Полацку падпарадкоўваліся кадэцкі корпус, усе духоўныя вучылішчы і царкоўна-прыходскія школы (далей – ЦПШ).

На працягу XIX – пачатку XX стст. на тэрыторыі Полаччыны, як і па ўсёй тэрыторыі Расійскай імперыі, існавала 3-ступенчатая сістэма навучальных устаноў: вучылішча –

PolotskSU

гімназія – універсітэт. На жаль, да пачатку ХХ ст. вышэйшых навучальных устаноў у Полацку пасля закрыцця акадэміі езуітаў больш не было адкрыта. На працягу адзначанага перыяду ў павятовым цэнтры дзейнічалі толькі некалькі вучылішч і гімназій. Рэакцыйная палітыка царскіх улад пасля двух нацыянальных паўстанняў і адступленне ад першапачатковых прынцыпаў арганізацыі ўстаноў адукацыі (такіх, як бессаслоўнасць, пераемнасць і бясплатнасць) зрабілі значны ўплыў на развіццё асветы і выхаванне моладзі на Полаччыне. Дакументы асобных фондаў НГАБ раскрываюць сутнасць дадзенай сацыяльнай сферы і даюць магчымасць больш дэталёва пазнаёміцца з асаблівасцямі развіцця ўстаноў адукацыі ў ХІХ – пачатку ХХ стст.

Самую вялікую колькасць дакументаў адзначанай тэматыкі прадстаўляюць фонды канцылярыі Віцебскага грамадзянскага губернатара (57 808 спраў), канцылярыі генерал-губернатара Віцебскага, Магілёўскага і Смаленскага (26 046 спраў) і Віцебскай дырэкцыі народных вучылішч (5 312 спраў) [1].

Беларускае генерал-губернатарства – гэта ваенна-адміністрацыйная адзінка Расійскай імперыі з цэнтрам у Віцебску, якое існавала з 1796 па 1856 г. З 1823 г., пасля далучэння да Магілёўскай і Віцебскай губерняў Смаленскай і Калужскай, Беларускае генерал-губернатарства атрымала назву Віцебскага, Магілёўскага і Смаленскага [2]. Генерал-губернатару, які меў фактычна неабмежаваную адміністрацыйную ўладу, падпарадкоўваліся ўсе падначаленыя ўстановы і службовыя асобы на тэрыторыі трох губерняў. Сваё кіраванне генерал-губернатары здзяйснялі пры дапамозе зацверджанай пры іх канцылярыі. У фондзе канцылярыі генерал-губернатара Віцебскага, Магілёўскага і Смаленскага (ф. 1430) захаваліся тры невялікія справы, якія ўтрымліваюць малавядомыя звесткі аб полацкіх прыватных жаночых школах Францыскі Левашкевіч, Эміліі Лапіцкай і Сафіі Козіч (с. 24080), а таксама інфармацыю аб былых езуіцкіх пабудовах на цэнтральнай гарадской плошчы, якія пасля закрыцця акадэміі былі перададзены Полацкім павятоваму і прыхадскому вучылішчам (с. 7459).

У фондзе канцылярыі Віцебскага грамадзянскага губернатара (ф. 1297), які ўключае дакументы за 1809–1917 гг., сканцэнтравана вялікая колькасць справаводных і статыстычных матэрыялаў, якія дэталёва малююць карціну дзейнасці навучальных устаноў Полаччыны. Аналіз рапартаў дырэктараў, ведамасцяў аб колькасці навучальных устаноў, цыркуляраў, дамоў і іншых відаў дакументаў дазваляе вылучыць падрабязную інфармацыю аб колькасці і руху педагагічнага складу, адсоткавых суадносінах дзяцей розных саслоўяў і веравызнанняў, аб стаўленні губернскага кіраўніцтва да сеткі гарадскіх навучальных устаноў. Так, у 1867 г. вялося актыўнае ліставанне паміж ганаровым блюсціцелем Полацкага казённага яўрэйскага вучылішча Ліпам Марголіным і Віцебскім грамадзянскім губернатарам У.М. Вяроўкіным. Па просьбе жыхароў Задзвінскай часткі горада Л. Марголін звяртаўся да губернскага кіраўніцтва з прапановай аб адкрыцці ў раёне Задзвіння 1-класнага яўрэйскага вучылішча для навучання хлопчыкаў рускай грамаце, арыфметыцы і чыстапісанню [3]. Блюсціцель яўрэйскага вучылішча склаў падрабязны план будучай навучальнай установы, падлічыў усе затраты на ўтрыманне і нават магчымасці зэканоміць частку грошай, але просьба так і не была задаволена (с. 33330).

PolotskSU



У 1880 г. Полацкая гарадская дума на чале з М.В. Літвынавым звярталася да Віцебскага грамадзянскага губернатара П.Я. Растоўцава з просьбай аб адкрыцці ў горадзе 6-класнага вучылішча, паколькі на той час у Полацку не было ніводнага падобнага кшталту навучальнай установы, а горад "во все времени служил центром и рассадником умственного просвещения этого же края" (с. 36 150 а) [4]. Ліставанне правягнулася і ў 1890-я гг. Губернскія ўлады толькі праз 20 гадоў далі дазвол на адкрыццё ў Полацку, праўда, не 6-класнага, а толькі 4-класнага вучылішча (с. 43 902).

Вялікая колькасць дакументаў па гісторыі адукацыі Полаччыны зберагаецца ў фондзе Віцебскай дырэкцыі народных вучылішч (ф.2507). Дадзены фонд прадстаўлены шырокім спектрам справаводчых матэрыялаў. Гэта справаздачы і ведамасці дырэкцыі аб стане вучэбных устаноў, рапарты штатных наглядчыкаў, спісы вучняў, пасведчанні аб заканчэнні навучальных устаноў, справаздачы аб перамяшчэнні і звальненні служачых, фармулярныя спіскі настаўнікаў і іншыя дакументы. Матэрыялы справаводства, як асобы від крыніц, валодаюць вялікімі інфармацыйнымі магчымасцямі і прадстаўляюць значную цікавасць для даследавання. Дадзены блок матэрыялаў не толькі дае магчымасць вывучаць гісторыю развіцця ўстаноў адукацыі вызначанага рэгіёна, але і ўтрымлівае цікавыя звесткі па гісторыі самога горада і павета.

У штогадовых справаздачах, якія Віцебская дырэкцыя народных вучылішч прадстаўляла папячыцелю навучальнай акругі, генерал-губернатару, грамадзянскаму губернатару, утрымліваліся статыстычныя дадзеныя аб колькасці навучальных устаноў з адсоткавымі паказчыкамі "добрых, "здавальняючых" і "нездавальняючых" школ па паветах, расходы вучылішч, настаўніцкія вакансіі, звесткі аб дзейнасці таварыстваў узаемадапамогі і інш.

Аналіз справаздач і ведамасцяў дадзенага фонду вызначыў склад навучальных устаноў, якія дзейнічалі ў Полацку ў XIX ст. Некаторыя з іх працавалі даволі працяглы час (напрыклад, павятовае і прыходскае вучылішчы, прыватны пансіён манашак-марыявітак), некаторыя праіснавалі зусім невялікі прамежак часу (напрыклад, пансіён манашак-базыльянак, прыватныя жаночыя пансіёны Атыліі фон Тэйхман і Цымерман).

Адной з інфармацыйна насычаных і добра ацалелых крыніц гэтага фонду з'яўляецца "Гістарычная запіска Полацкага Дваранскага павятовага вучылішча за 1834 г.", складзеная штатным наглядчыкам установы Аляксандрам Плота (с. 45). У ёй падрабязна распавядаецца пра склад адукацыйна-выхаваўчай работы вучылішча, падаюцца статыстычныя дадзеныя аб колькасці навучэнцаў, аб складзе і перамяшчэнні настаўнікаў, аб стане бібліятэкі, аб папаўненні яе кнігамі, перыядычнымі выданнямі і геаграфічнымі картамі, а таксама кароткая інфармацыя пра свята напрыканцы вучэбнага года [5] .

Справаводчыя і статыстычныя матэрыялы па гісторыі Полаччыны ўтрымліваюць і дакументы з фонда канцылярыі папячыцеля Беларускай вучэбнай акругі (ф. 3157). Дэталёвы аналіз справаздач (сс. 70, 80, 85) за 1830-я гг. даў магчымасць скласці табліцы аб навучэнцах і настаўніках губерні з указаннем іх веравызнання (праваслаўныя, стараабрадцы, католікі, лютэране, іўдзеі, мусульмане) і саслоўя (дваране, духавенства, гарадское саслоўе, сельскае саслоўе, іншаземцы).

PolotskSU



Інфармацыю дадзенага кшталту, але ўжо за 1860-я гг., можна знайсці сярод дакументаў фонда Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта (ф. 2502). Аналіз падобных дакументаў дае магчымасць вызначыць структуру і дынаміку развіцця ўстаноў адукацыі Полацка ў аспекце ўсёй Віцебскай губерні.

На Полаччыне падчас уваходжання яе ў склад Расійскай імперыі асноўную частку навучальных устаноў складалі пачатковыя вучылішчы. Частка інфармацыі пра дзейнасць гарадскіх вучылішч за 1900–1917 гг. утрымліваецца ў дакументах фонда Інспектара народных вучылішча Полацкага павету (ф.3068). Інспектары назначаліся ў складзе вучылішчных саветаў пры дырэкцыі народных вучылішч акругоў МНА па прадстаўленні папячыцеля вучэбнай акругі. Галоўным абавязкам іх быў асабісты нагляд за станам адукацыйна-выхаваўчай працы ва ўсіх вучэбных установах вызначанага ўчастка, у тым ліку прыватных і яўрэйскіх. Фонд Інспектара народных вучылішча Полацкага павета ўтрымлівае цыркуляры дырэктараў навучальных устаноў, пратаколы іспытаў камісіі, спісы выпускнікоў, запыты настаўнікаў аб прыёмах на працу, асабістыя справы настаўнікаў, фінансавыя справаздачы і інш.  Менавіта ў гэтым фондзе захавалася вялікая колькасць матэрыялаў па адноўленным у пачатку XX ст. Полацкім прыходскім вучылішчы, якое раней не трапляла ў поле зроку даследчыкаў. Гэта пасведчанні аб заканчэнні вучылішча (1911 г.), рапарты і справаздачы настаўніка Івана Эвеля (1912, 1915 гг.), пратаколы і выклікі на іспыты (1912–1913 гг.), каштарыс на рамонт мэблі (1916 г.), ведамасці аб адсоткавых прыбаўках да заробкаў настаўнікаў (1916 г.) і інш. Полацкае прыходскае вучылішча дзейнічала каля 10 гадоў – з 1907 па 1918 г. Паводле архіўных дакументаў, вучылішча размяшчалася ў 1-павярховым драўляным доме каля Чырвонага моста па вуліцы Рыжскай. Склад навучэнцаў быў невялікім – каля 100 чалавек, якіх навучалі 3 настаўнікі. Падчас Першай сусветнай вайны вучылішча перавялі ў дом Кісялёва па вуліцы Гарбузовай, а ў доме па вуліцы Рыжскай размясціўся Літоўскі бежанскі камітэт (с. 11) [6, с. 45.].

Менавіта ў гэтым фондзе былі знойдзены пакуль што адзіныя вядомыя на сённяшні дзень звесткі пра дзейнасць у 1915 г. Полацкага стараабрадніцкага вучылішча, настаўнікам якога быў В. Шэлегаў (с. 7). Усяго ж на пачатку Першай сусветнай вайны ў Полацку дзейнічала каля 17 навучальных устаноў, якія падпарадкоўваліся Міністэрству народнай асветы, ваеннаму ці духоўнаму ведамствам. Але пры колькасці па Полацкаму павету ў 121 тысячу жыхароў навучалася толькі каля 5,5 тысяч дзяцей, што складала 4,5 % ад агульнай колькасці насельніцтва Полаччыны [7, л. 45].

Пра дзейнасць навучальных устаноў у часы Першай сусветнай вайны ў Полацку захавалася не так шмат звестак. Большасць устаноў адукацыі ў 1915 г. было эвакуіравана з горада, частка скарочана або ўвогуле закрыта. Звесткі аб дзейнасці некаторых гарадскіх вучылішч можна знайсці ў фондзе Полацкай земскай управы (ф. 2564). Падчас вайны земскія ўправы займаліся забеспячэннем і нарыхтоўкай для войска харчавання, фуражу, абмундзіравання, абутку, арганізацыяй шпіталяў, прыёмам і размяшчэннем бежанцаў, адкрыццём для іх баракаў, санітарных пунктаў, падрыхтоўкай да эвакуацыі ўстаноў і арганізацый. У дадзеным фондзе захаваліся спісы настаўнікаў земскіх вучылішч Полацкага павета за 1914 г. на ўтрыманне ў касу ўзаемадапамогі на карысць Чырвонага

PolotskSU



Крыжа па 3 рублі з кожнага [8, л.1], а таксама дакументы пра арганізацыю ў маёнтку Аўдашковічы Полацкага павета дзіцячага прытулку імя Елізаветы Фёдараўны, пры тым што сам камітэт па ўладкаванні бежанцаў арганізацыі "Северопомощь" размяшчаўся ў памяшканнях Полацкай земскай управы на вуліцы графа Талстога (с. 95).

Гэты фонд утрымлівае і сметы за 1917 г. на ўтрыманне Полацкай настаўніцкай семінарыі. У цыркуляры ўказваліся колькасць служачых, іх аклады, кватэрныя грошы, сутачныя прыбаўкі (с. 179). Гэты дакумент змяшчае звесткі і пра колькасць ЦПШ на тэрыторыі Полацкага павета. У справе быў і зварот старшыні Полацкага аддзялення Епархіяльнага вучылішчнага савета пратаірэя М.І. Дуброўскага і полацкага павятовага назіральніка У. Лапачэўскага да старшыні Полацкай земскай управы Д.М. Васілеўскага аб уключэнні некалькіх ЦПШ, якія адносяцца да гарадскіх храмаў, у спіс гарадскіх навучальных устаноў. Напрыканцы 1917 г. просьба была задаволена (с. 248).

На Полаччыне Духоўнаму ведамству акрамя ЦПШ (за выключэннем 1864–1880 гг.) падпарадкоўваліся таксама школы граматы, духоўныя вучылішчы і семінарыі. Частка навучальных устаноў існавала пры полацкіх манастырах – мужчынскім Богаяўленскім, жаночым Спаса-Еўфрасіннеўскім і інш. З 1860-х гг. за дзейнасцю дадзеных навучальных устаноў усіх тыпаў стаў сачыць камітэт пры Свяцейшым Сінодзе.

У фондзе Благачыння манастыроў Полацкай епархіі (ф.2694) захаваліся дакументы 1840-х гг. аб дзейнасці ў Полацку дзячкоўскага вучылішча, пераведзенага ў 1845 г. у пабудову Полацкага Богаяўленскага мужчынскага манастыра. Вучнямі дадзенай навучальнай установы былі дзеці панамароў і дзячкоў Полацкай праваслаўнай епархіі. Сярод 23-х навучэнцаў – хлопчыкі ва ўзросце ад 11 да 21 года. У вучылішчы на працягу 6-дзённага працоўнага тыдня выкладаліся катэхізіс і свяшчэнная гісторыя, чыстапісанне ўстава і спеваў, славянскае і рускае чытанне, пачатковыя асновы арыфметыкі і лічэння на лічыльніках [9, л.4]. Сярод дакументаў аб дзейнасці ўстановы за 1840-я гг. ёсць дзве дамовы аб пастаўках вучылішчу абутку полацкім шаўцом Еўстафіем Леонавым – для кожнага вучня і служачага манастыра па 4 пары на адзін навучальны год, а таксама на рамонт падраснікаў і іншага адзення полацкім яўрэем Моськам Лазаравым (с. 198).

У гэтым фондзе захаваліся рэдкія звесткі і пра адкрыццё пры Полацкім Барысаглебскім заштатным манастыры пачатковага вучылішча, у якім 1852 г. навучалася ўсяго 2 хлопчыкі і 1 дзяўчынка (с. 377).

Звесткі пра дзейнасць полацкіх мужчынскага і жаночага духоўных вучылішч, акрамя асабістых фондаў, можна сустрэць і сярод дакументаў Полацкай гарадской думы (ф.2523). Афіцыйна дадзены орган мясцовага самакіравання пачаў працаваць з 1879 г., але ў НГАБ захоўваюцца дакументы, якія асвятляюць дзейнасць установы ў 1859–1914 гг. Для даследчыкаў гісторыі адукацыі Полацка XIX ст. уяўляе цікавасць дакумент "Маршруты кварталаў г. Полацка 1858–1859 гг.", якія ўтрымліваюць шмат звестак аб месцах размяшчэння гарадскіх навучальных устаноў (напрыклад, Полацкага духоўнага вучылішча па вул. Верхне-Пакроўскай, Полацкага казённага яўрэйскага вучылішча па вуліцы Ніжне-Пакроўскай, жаночага прыватнага пансіёна Элеаноры Радзевіч па вуліцы Рыжскай і Азараўскай), а таксама звесткі аб полацкіх настаўніках і іх семьях (напрыклад, Франц Морчавіч, Іосіф Іванавіч Хруцкі, Міхаіл Паўлавіч Залатароў – настаўнікі Полацкага

PolotskSU



дваранскага вучылішча; Нікіфар Кайгародаў, Мікалай Андрэеў, Фёдар Вольф, Мікалай Кузьмін – настаўнікі Кадэцкага корпуса; Людвіг Паплаўскі – настаўнік Полацкага прыходскага вучылішча) [10].

Некалькі фондаў НГАБ, куды ўвайшлі дакументы канкрэтных навучальных устаноў Полацка, асабліва калі яны дзейнічалі працяглы час, з'яўляюцца найбольш карыснымі ў галіне даследавання па гісторыі развіцця адукацыі. Да вызначанага перыяду адносіцца 11 фондаў, якія цікавілі навукоўцаў у розныя часы. На жаль, 4 з іх утрымліваюць не болей за 10 малазмястоўных спраў і не могуць прадставіць поўную карціну дзейнасці ўстановы. Таму ў навуковы зварот уведзены матэрыялы астатніх 7 фондаў, якія актыўна выкарыстоўваюцца даследчыкамі. Гэтыя дакументы датычацца дзейнасці Полацкай настаўніцкай семінарыі (ф. 2566), Полацкай жаночай гімназіі (ф. 2568), Полацкай мужчынскай гімназіі (ф. 2608), Полацкага духоўнага вучылішча (ф. 2612), Полацкага кадэцкага корпуса (ф. 2613), Полацкага 1-га вышэйшага пачатковага вучылішча (ф. 2671), Полацкага 2-га вышэйшага пачатковага вучылішча (ф. 2669).

Такім чынам, аналіз дакументаў з фондаў НГАБ дазваляе рознабакова прадставіць развіццё большасці ўстаноў адукацыі на Полаччыне падчас уваходжання яе ў склад Расійскай імперыі. Справаводныя дакументы, складзеныя для губернскіх і акруговых кіруючых органаў, звычайна ўяўлялі сабой табліцы з загадзя вызначанымі крытэрыямі адбору інфармацыі. Дадзены від дакументаў прадстаўляў структуру і дынаміку развіцця навучальных устаноў. Службовая ж перапіска – рапарты або лісты – маглі складацца ў больш вольнай форме і ўтрымліваць больш рэдкую і цікавую інфармацыю, знайсці якую ў іншых дакументах раней было немагчыма. Нераўнамернае размеркаванне дакументаў па развіцці адукацыі болей чым у 20 фондах НГАБ ні ў якім разе не змяншае каштоўнасці ніводнага дакумента, якія дапаўняюць і ўдакладняюць агульнае інфармацыйнае поле дэталямі і дробязямі. Пошук новых звестак па развіццю адукацыі на Полаччыне ў вызначаны перыяд павінен прывесці да напісання новых даследаванняў больш якаснага ўзроўню.

ЛІТАРАТУРА

1. Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802-1917) [Электронны рэсурс] / сост. и науч. ред. Е.К. Анищенко. – 2009. – Минск. – Рэжым доступа: http://pawet.net/library/history/bel_history/aniszcz/06.html. – Дата доступа: 26.02.2018.
2. Фондавы каталог дзяржаўных архіваў Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://fk.archives.gov.by/catalogue/9/. – Дата доступа : 24.02.2018.
3. Воднева, І.П. Да пытання аб яўрэйскіх пачатковых навучальных установах сярэдзіны XIX – пачатку XX стст. / І.П. Воднева // Полацкі музейны штогоднік : зб. навук. арт. за 2013 г. / укл. Т.У. Явіч. – Полацк : [НПГКМЗ], 2014. – 288 с. : іл. – С. 61–83.
4. Воднева, І.П. Да пытання аб дзейнасці пачатковых навучадбных устаноў г. Полацка ў пачату XX ст. Полацкае гарадское 4-класнае вучылішча / І.П. Воднева // Полацкі

PolotskSU



музейны штогоднік : зб. навук. арт. за 2014 г. / укл. Т.У. Явіч. – Полацк : [НПГКМЗ], 2015. – 312 с. : іл. – С. 84-92.
5. Воднева, І.П. Полацкае Дваранскае павятовае вучылішча / І.П. Воднева // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 2008 г.) / укл. Т.А. Джумантаева. – Полацк : [НПГКМЗ], 2009. – С. 21–24.
6. Воднева, І.П. Да пытання аб сацыяльным становішчы ў Полацку падчас Першай сусветнай вайны / І.П. Воднева // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт. ІІ міжнарод. навук. канф., Полацк, 17-18 красавіка 2014 г. : у 2 ч. / пад агул. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача, С.А. Шыдлоўскага. – Наваполацк : ПДУ, 2014. – Ч. 2. – С. 43–48.
7. Спісы ЦПШ Полацкага павета за 1914 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). – Ф. 3068. Воп. 1. С. 7.
8. Спісы настаўнікаў земскіх вучылішч Полацага павета на ўтрыманне грошай у касу узаемадапамогі за 1914 г. // НГАБ. – Ф. 2564. Воп. 1. С. 68.
9. Справы аб пераводзе дзячкоўскага вучылішча пры Полацкай духоўнай семінарыі ў Полацкі Богаяўленскі манастыр за 1845 – 1846 гг. // НГАБ. – Ф. 2694. Воп. 1. С. 198. Л. 1–14.
10. Воднева, І.П. Полацкае прыходскае вучылішча (1820-1863) / І.П. Воднева // Полацкі музейны штогоднік : зб. навук. арт. за 2013 г. / укл. Т.А. Джумантаева, А.У. Шумовіч, Т.Р. Смірнова. – Полацк : [НПГКМЗ], 2011. – 284 с. : іл. – С. 27–36.

## THE ACTIVITIES OF EDUCATIONAL INSTITUTIONS OF POLOTSK AT THE END OF XVIII - EARLY XX CENTURIES. BASED ON THE NATIONAL HISTORICAL ARCHIVE OF BELARUS

*I. VODNEVA*

*The article reveals the information potential of written sources on the history of the development of educational institutions Polotsk XIX - early XX centuries. from the National Historical Archive of Belarus.*